СКЛАД
арганізацыйнага камітэту
па падрыхтоўцы і правядзенні
абласнога конкурсу
выканаўцаў  на баяне, акардэоне
і цымбалах  «Палескія музыкі»

| | |
|---|---|
| Ліпко<br>Анатолій Сяргеевіч | дырэктар УА «Пінскі дзяржаўны каледж мастацтваў» |

Члены арганізацыйнага камітэту:

| | |
|---|---|
| Крыштопчык<br>Таццяна Мікалаеўна | намеснік дырэктара па ВІР<br>УА «Пінскі дзяржаўны каледж мастацтваў» |
| Красько<br>Марыя Цімафееўна | кіраўнік практыкі<br>УА «Пінскі дзяржаўны каледж мастацтваў» |
| Камісарчук<br>Таццяна Пятроўна | старшыня цыклавой камісіі «Інструменты народнага аркестра  і дырыжыравання»<br>УА «Пінскі дзяржаўны каледж мастацтваў» |

ЗАЦВЕРДЖАНА
Дырэктар
УА«Пінскі дзяржаўны
каледж мастацтваў»
А.С.Ліпко
01.09.20

# Палажэнне
## аб абласным конкурсе выканаўцаў на баяне, акардэоне і цымбалах «Палескія музыкі»

1.Арганізатарамі абласнога конкурсу выканаўцаў на баяне, акардэоне і цымбалах «Палескія музыкі» (далей конкурс) з'яўляецца ўстанова адукацыі "Пінскі дзяржаўны каледж мастацтваў" і цыклавая камісія «Інструменты народнага аркестра і дырыжыравання»

2.Асноўнымі мэтамі конкурсу з'яўляюцца:

- выяўленне і падтрымка юных талентаў, развіццё іх творчых здольнасцей, павышэнне ўзроўня выканальніцкага майстэрства;
- папулярызацыя выканальніцтва на баяне, акардэоне і цымбалах;
- абмен вопытам работы настаўнікаў ДШМ і выяўленне ўзроўня прафесійнай падрыхтоўкі навучэнцаў школ мастацтваў.

3. У конкурсе могуць прымаць удзел выканаўцы на баяне, акардэоне і цымбалах, навучэнцы адукацыйных устаноў сістэмы Міністэрства адукацыі і Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь (акрамя навучэнцаў ССУА), якія навучаюцца па спецыяльнасцям баян, акардэон і цымбалы (далей - канкурсанты).

4. Для непасрэднага кіравання правядзеннем конкурсу ствараецца арганізацыйны камітэт (далей – аргкамітэт).

5.Аргкамітэт:

- ажыццяўляе кіраўніцтва падрыхтоўкай і правядзеннем конкурсу;
- разглядае і зацвярджае склад журы конкурсу;
- узаемадзейнічае з зацікаўленымі суб'ектамі культурнай дзейнасці і іншымі арганізацыямі па пытаннях падрыхтоўкі, правядзення і асвятлення конкурсу ў сродках масавай інфармацыі;
- вырашае іншыя пытанні, якія ўзнікаюць у ходзе падрыхтоўкі і правядзення конкурсу.

6.Пасяджэнні аргкамітэту лічацца правамоцнымі, калі ў іх прымае ўдзел не менш за дзве трэція яго складу.Рашэнні аргкамітэту прымаюцца адкрытым галасаваннем і лічацца прынятымі, калі за іх прагаласавала больш паловы членаў аргкамітэта, прысутных на пасяджэнні.

Рашэнне аргкамітэту афармляецца пратаколам,які падпісвае старшыня аргкамітэту.

7.Для прафесійнай ацэнкі канкурсантаў аргкамітэт зацвяджае склад членаў журы конкурсу (далей - журы) ў колькасці трох чалавек у кожнай катэгорыі. Журы складаецца з выкладчыкаў каледжа.

8.Журы:
- ацэньвае прафесійны і творчы ўзровень выканання канкурсантаў;
- афармляе пратаколы вынікаў галасавання;
- выбірае прызёраў і дыпламантаў конкурсу,уладальнікаў узнагарод у кожнай з катэгорый і ўзроставых груп конкурсу і прадстаўляе іх спіс у аргкамітэт для ўзнагароджвання;
- інфармуе канкурсантаў аб выніках іх удзелу ў конкурсе.
9.Журы ацэньвае канкурсантаў па наступных крытэрыях:
- узровень тэхнічнага майстэрства;
- адметнасць творчай індывідуальнасці выканаўцы;
- трапнасць перадачы стылістычных асаблівасцяў твораў.
10.Размеркаванне прызавых месцаў і спецыяльных прызоў адбываецца шляхам галасавання ўсіх членаў журы.
11. Рашэнні журы прымаюцца на пасяджэннях і афармляюцца пратаколамі,якія падпісваюць члены журы. Усе рашэнні журы канчатковыя і не могуць быць аспрэчаны.
12.Умовы правядзення конкурсу:
12.1.Конкурс праводзіцца ў трох катэгорыях:
- баян/акардэон і цымбалы (сола)
- ансамблевае выканаўніцтва (дуэт, трыа, квартэт смешанага і аднароднага тыпаў)
12.2. У катэгорыі баян/акардэон установлены наступныя ўзроставыя групы:
1 група А – 8-10 гадоў (уключна);
2 група В – 11-13 гадоў (уключна);
3група С– 14-16 гадоў (уключна);
12.3. У катэгорыі цымбалы ўстаноўлены наступныя ўзроставыя групы:
1 група А - 13-16 гадоў (уключна);
12.4. У катэгорыі ансамблевае выканаўніцтва ўтаноўлены наступныя ўзроставыя групы:
1 група А– 8-12 гадоў (уключна);
1 група В– 13-16 гадоў (уключна).
Праграмныя патрабаванні :
Узроставыя групы:
Баян, акрдэон :
1 (А) ; 2 (В) група – два рознахарактарныя творы;
3 (С) група – паліфонія,буйная форма, твор на выбар;
Цымбалы :
Група (А) - два рознахарактарныя творы (адзін з іх беларускага аўтара);
Ансамблевае выканаўніцтва:
1 (А) ; 2 (В) група – два рознахарактарныя творы.
Уся праграма выконваецца на памяць.
12.5.Для ўдзелу ў конкурсе асобна канкурсант альбо ўстанова адукацыі, у якой ён навучаецца з 02.01.2021г. да 25.01.2021г .накіроўвае наступныя матэрыялы:
- запоўненую форму заяўкі;

- копію пашпарта або пасведчанне аб нараджэнні.

Пытанні наконт заяўкі і ўдзелу ў конкурсе накіроўваюцца на адрас :
Рэспубліка Беларусь,225710 г.Пінск,вул.В.Хоружай,12,
УА "Пінскі дзяржаўны каледж мастацтваў"
Тэл./факс (80165) 65 06 08; тэл.32 40 50, 65 98 22/.

12.6. Уступны ўзнос для ўдзелу ў конкурсе складае:

- у катэгорыях "Баян/акардэон" і "Цымбалы" - 35 беларускіх рублёў;
- у катэгорыі "Ансамблевае выканаўніцтва" - 20 беларускіх рублёў з кожнага канкурсанта.

Аплата ўступнага ўзноса конкурса аплачваецца банкаўскім пераводам на разліковы рахунак УА "Пінскі дзяржаўны каледж мастацтваў":
ЦБУ №406 ОАО "Белінвестбанк"
р/ рахунак BY61BLBB36420200299092001001
код BLBBBY2X
УНН 200299092
ОКПО14809596
Адрас банка: 225710 г.Пінск,вул.Першамайская,16

12.7. У катэгорыях "Баян/акардэон" , "Цымбалы" і "Ансамблевае выканаўніцтва" конкурс праводзіцца ў два туры.

1 тур – адборачныя праслухоўванні на месцах.Да ўдзелу ў конкурсе дапускаецца ад кожнай навучальнай установы не больш за 5 (пяць) салістаў і ансамбляў у кожнай намінацыі і ўзроставай групе.

2 тур – заключны.

Конкурсныя праслухоўванні адбываюцца ў форме публічных выступленняў у перыяд з 18 лютага па 19 лютага 2021 г.

12.8.Парадак выступлення на конкурсе будзе вызначацца ў кожнай групе падчас рэгістрацыі.

13.Пераможцы конкурсу ва ўсіх узроставых групах кожнай катэгорыі атрымліваюць дыпломы I, II,III ступені з прысваеннем звання Лаўрэата конкурсу. Журы мае права прызначыць Гран-пры аднаму з уладальнікаў першага месца ў любой узроставай групе, які паказаў выдатныя прафесійныя і творчыя здольнасці.

14.Журы мае права радзяліць месца паміж канкурсантамі або не прысуджаць яго нікому .

15. Канкурсанты, якія паказалі добрыя, але недастатковыя для дасягнення прызавых месцаў вынікі, атрымліваюць дыпломы ўдзельніка.

16.Аплата праезду, а таксама ўсе расходы па прыбыванні ўдзельнікаў ажыццяўляецца за кошт накіроўваючага боку.

17.Удзел ў конкурсе разглядаецца як поўная згода з усімі ўмовамі.

18.Расходы на правядзенне конкурсу ажыццяўляюцца з па-за бюджэтных сродкаў згодна сметы, зацверджанай кіраўніком.

19.**У сувязі з эпідэміялагічнай сітуацыяй,конкурс можа праходзіць дыстанцыйна.Тэрмін правядзення будзе аб'яўлены дадаткова.**

20. Кантакты конкурсу:

Электронная пошта:

Тэл./факс (80165) 65- 06- 08
Тэлефоны: +375 -29 -144-78- 03
Сайт каледжа: www.artpinsk.by
Фізічны адрас: 225710 г.Пінск, вул.В.Хоружай,12. УА "Пінскі дзяржаўны каледж мастацтваў"

**Заяўка**
**на ўдзел у абласным конкурсе**
**выканаўцаў на баяне, акардэоне і цымбалах**
**"Палескія музыкі"**

1.Прозвішча, імя і імя па бацьку ўдзельніка.
2.Дата нараджэння ( чысло,месяц, год).
3.Намінацыя (інструмент), узроставая група.
4.Назва і адрас навучальнай установы.
5.Тэл/ факс, е- mail/
6. Прозвішча, імя і імя па бацьку настаўніка
(для цымбалістаў – канцэртмайстра)
7. Праграма выступлення і час гучання.
8. Дата, пячаць і подпіс кіраўніка навучальнай установы.